
Ілюстрацыя: Іван Хруцкі. Аўтапартрэт / wikipedia.org

# Ян (Іван) Хруцкі

**Ян Хруцкі нарадзіўся 8 лютага 1810 года ў мястэчку Ула на Віцебшчыне ў Беларусі.**

Ягоным бацькам быў Тамаш Хруцкі – беларускі грэцка-каталіцкі святар у вёсцы Усая. То бок і паводле паходжання, і паводле месца нараджэння ён быў беларусам. Пачаткі адукацыі Іван Хрцукі атрымаў дома. А затым паступіў у езуіцкую акадэмію ў Полацку, дзе здабыў ужо і прафесійную мастакоўскую падрыхтоўку. Ужо з беларускаю мастацкай адукацыяй малады Хруцкі прыехаў у Расею, у Пецярбург, дзе пачаў вучыцца з 1830 года ў тамтэйшай акадэміі мастацтваў.

У 1836 годзе Хруцкага ўзнагародзілі Галоўным Срэбным медалём акадэміі за нацюрморты. Тамсама мастак пісаў шмат партрэтаў, адзін з якіх – «Пажылая жанчына, якая вяжа шкарпэткі» – прынесла яму Малы Залаты медаль акадэміі. У 1839 годзе яму прысвоілі тытул акадэміка. Але ўжо праз год, пасля смерці бацькі ў 1840-ым, Хруцкі назаўсёды пакінуў Санкт-Пецярбург і вярнуўся ў Беларусь, дзе і жыў да канца сваіх дзён. Домам мастака стаўся маёнтак Захарнічы на роднай Полаччыне, набыты ў 1844-м, дзе менавіта і была створаная большасць ягоных твораў.

Тое, што мастак меў дачыненне да духавенства, знайшло адлюстраванне ў шмат якіх ягоных творах. Гэта партрэты апошняга беларускага ўніяцкага мітрапаліта Ігнацыя Язафата Булгака, уніяцкіх (а пасля праваслаўных) біскупаў Васіля Лужынскага і Ёсіфа Сямашкі. Апроч таго, Хруцкі стварыў партрэты наступных дзеячаў уніяцкай (а пасля праваслаўнай) царквы: епіскапаў Антонія Зубка, Антонія Тупальскага, Міхала Галубовіча, Ігнацыя Жалязоўскага, былога рэктара Полацкай духоўнай семінарыі Міхала Шалепіна, рэктара Літоўскай духоўнай семінарыі Філарэта Малішэўскага, протаіерэя Плакіда Янкоўскага і, урэшце, манаха-базыляніна Вінцэнта Лісоўскага, іераманаха Траецкага базыльянскага манастыра ў Вільні.

З 1846 да 1854 года часта бываў і працаваў у Вільні. Такія творы, як партрэты гісторыка Балінскага, пісьменнікаў Маліноўскага, Янкоўскага ды іншых, вылучылі Хруцкага ў лік найлепшых партрэтыстаў эпохі. Тамсама Хруцкі напісаў 32 партрэты святароў.

У сваёй беларускай сядзібе Захарнічы на роднай Полаччыне Іван Хруцкі жыў і працаваў да самае смерці ў 1885 годзе. Менавіта там быў напісаны славуты абраз святога Казіміра, што зберагаецца ў зборы літоўскага Нацыянальнага мастацкага музею імя М. Чурлёніса ў Коўне.

Памёр Іван Хруцкі 13 студзеня 1885 года, пахаваны на фамільных могілках у Захарнічах. Такім чынам, ён пражыў у Беларусі, дзе нарадзіўся, вырас, пачаў мастацкую адукацыю, амаль усё жыццё. Ён увайшоў у гісторыю мастацтва Усходняй Еўропы як выбітны майстар у жанрах нацюрморту, партрэту і архітэктурнага пейзажу. Ягоная творчасць моцна паўплывала на мастацкае жыццё цяперашніх Літвы, Расеі і Польшчы, але ён чэрпаў натхненне і працаваў у Беларусі, дзе і пачаў свой шлях у мастацтва.

Святарскі ж род Хруцкіх, цяпер ужо праваслаўны, працягваў быць адным з самых шматлікіх у Беларусі, пакуль у 1920-ыя духоўных дынастыяў гвалтам не абарвала савецкая ўлада.